УДК 314.1:321.01(476)(091)“1950/1960”

# САЦЫЯЛЬНА-ДЭМАГРАФІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ БССР У 50-60 Х ГГ., ЯК ФАКТАР РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ.

Поляк Наталля Аляксандраўна
Дацэнт кафедры філасофіі і паліталогіі УА “Беларускі дзяржаўны мэдыцынскі ўніверсітэт”; кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Мінск, Беларусь)

***У артыкуле гаворыцца аб вызначальнай ролі соцыўма ў дзяржаватворчых працэсах. Разглядаюцца асаблівасці беларускага савецкага грамадства ў 50-60 х гг. і іх уплыў на функцыянаванне партыйна-палітычнага апарата.***

Падрабязнае вывучэнне гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў апошні час стала асноўным накірункам дзейнасці айчынных даследчыкаў. Нягледзячы на тое, што гістарыяграфія гісторыі Беларусі досыць багатая, на сёняшні дзень застаецца шмат тэм, якія недаследаваны. Ёсць у гісторыі нашай дзяржавы цэлыя перыяды, якія патрабуюць больш дасканалага вывучэння з улікам нацыянальнай факталогіі.

На наш погляд пасляваенныя часы ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці з’яўляюцца аднымі з самых значных і адначасова невывучаных. У першую чаргу з-за таго, што фарміраванне айчыннай даследчыцкай гістарычнай школы пачалося толькі ў 90-х гг XX ст., а разгляд мінуўшчыны савецкай Беларусі навукоўцамі папярэдняга часу, быў у асноўным даведачна-інфармацыйным. Савецкія гісторыкі выкарыстоўвалі партыйна-ідэалагічны падыход і часта не закраналі эвалюцыйных змен у нетрах грамадскага асяроддзя, якія істотна ўплывалі на дзяржаватворчыя працэсы. Значнасць абранай тэмы падкрэсліваецца яшчэ і тым, што навуковая цікавасць да сацыяльна-дэмаграфічных пытанняў, адзнаменавана зноў узнікшай патрэбай у звестках, пазбаўленых аднабаковасці.

Вывучэнне грамадства БССР і асаблівасцей адносін у ім часоў “адлігі”, з’яўлаецца асноўнай мэтай артыкула. Робіцца спроба паказаць як сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі Савецкай Беларусі ўплывалі на удасканальванне палітычных працэсаў і на змены ў кіраванні грамадскай і гаспадарчай сферамі. Гэта, як вядома, былі фундаментальныя элементы дзяржаўнасці.

Грамадства Беларускай ССР пасля XX з’езду КПСС і выступлення М. Хрушчова 24 лютага 1956 г. пачало адчуваць агульнасаюзныя тэндэнцыі дэмакратызацыі. Кіраўніцтва ЦК КПБ з 1956 г. ажыццяўляў К.Ц. Мазураў, які актыўна пачаў пашыраць прынцып калектыўнасці партыйнага кіраўніцтва і далучаць грамадства да дзяржаўных спраў (сустрэчы насельніцтва з партыйнымі лідэрамі, выбарнаць на дзяржаўныя

пасады, пашырэнне складу партыйных раённых і гарадскіх камітэтаў, заахвочванне радавых камуністаў да ўнутрыпалітычнай дзейнасці).

Сацыяльна-дэмаграфічная карціна БССР у час “адлігі” пачала мяняцца і мела шэраг асаблівасцей, у параўнанні з астатнімі савецкімі рэспублікамі. Сярод асноўных характарыстык насельнітцтва, найбольш красамоўнымі з’яўяюцца: прафесійны, нацыянальны, полаўзростны склад, паказчыкі сярэдняй працягласці жыцця, узроўня медыцынскага абслугоўвання. урбанізаванасць грамадства, уровень натуральнага прыросту, сямейна-шлюбныя адносіны, адукаванасць насельніцтва і інш. А згодна з методыкай А.Г. Панамаровай, усе вышэйпералічаныя характарыстыкі валодаюць самым высокім балам у шкале фактараў умацавання дзяржаўнасці [3, с. 21],

Што сабой ўяляла грамадства Беларусі ў сярэдзіне 50-х – сярэдзіне 60 – х гг. адказаць досыць складана. Вядома, што па выніках усесаюзнага перапісу насельніцтва 1959 г. у БССР налічвалася 8 млн. 60 тыс. чалавек, з іх 31% пражывала ў гарадах, 69 % у вёсцы. 509 з паловай тысяч, жылі ў Мінску. Да 1970 г. (год наступнага перапісу) назіраўся прырост гарадскога насельніцтва да 43 % ад агульннай колькасці жыхароў [4, с.138].

Відазмяменне насельніцтва адбывалася некалькімі шляхамі. Так, напрыклад, карціна прафесійнай занятасці, згодна з перапісам 1959 г. паказвала, што толькі 19% працавала ў прамысловасці і будаўніцтве. Але ў гэтых галінах назіраўся паступовы прырост працоўных, у сувязі з павелічэннем тэмпаў развіцця машынабудаўнічай, хімічнай, нафтахімічнай, паліўна-энергетычнай і іншымі сферамі вытворчасці. Павелічэнню колькасці рабочага класу садзейнічала складанае становішча жыхароў вёскі і занятых у калгасах людзей. Міграцыя сельскіх жыхароў, у асноўным моладзі, у пошуках працы ў горад, паскаралася, але пры гэтым гараджане захоўвалі ў сваім жыцці вялікую долю сельскагаспадарчай працы (праца на лецішчы бацькоў, прысядзібных падвор’ях) для забеспячэння сваіх сямей прадуктамі.

Жыццё ў вёсцы ўскладнялася не толькі цяжкай самой па сабе працай, але і нізкімі заробкамі калгаснікаў, адсутнасцю інфраструктуры, дыфіцытам тавараў першай неабходнасці. Часам вёскі атрымлівалі статус “неперспектыўных” і ліквідаваліся. Пенсіі калгаснікам да 1964 г. не выплочвалі ўвогуле, і пасля прыняцця пастановы “Аб пенсіях і дапамогах членам калгасаў” грошы давалі выключна членам сельгасарцелі [2, с.394].

Клас працоўных папаўняўся і за кошт прыбываючых вайскоўцаў і рабочых з іншых краін. Спецыялістаў з розных сфер прамысловай вытворчысці, у большасці рускіх, дасылалі з мэтай кіраўніцтва пабудовай сацыялістычнай дзяржавы. Аб значнай долі небеларускага насельніцтва на адміністрацыйных і кіраўнічых пасадах буйных прадпрыемстваў і іншых устаноў, сведчыць вялікая колькасць зваротаў (прыватных і ад арганізацый) у міністэрства Асветы БССР, дзе гучалі просьбы арганізаваць

работу школ на рускай мове і дазволіць не вывучаць беларускую мову і літаратуру ўвогуле. “На прадпрыемствах працуюць спецыялісты рускай нацыянальнасці, а яны зацікаўлены ў рускамоўным навучанні сваіх дзяцей”, пазначалася ў лістах [1, с.73].

Аб ролі і месцы рабочых у развіцці і пабудове беларускай дзяржаўнасці савецкага часу, так сама могуць сведчыць дадзеныя аб прафсаюзных арганізацыях у прамысловасці. У разглядаемы перыяд колькасць членаў прафсаюзаў БССР павялічвалася – з 1030 чалавек у1954 г. да 2135 у 1963 г. [1, с. 58]. Тэмпы роста членаў прафесійных саюзаў былі абумоўлены тым, што працоўныя былі аб’ектыўна зацікаўлены ў пашыраным супрацоўніцтве з партыйна-палітычным кіраўніцтвам краіны, уздзеянні праз існуючыя механізмы на прыняцце дзяржаўных рашэнняў і росце аўтарытэту працоўных як часткі соцыўма.

Уплывовай і досыць масавай была маладзёжная арганізацыя – Ленінскі камсамол. Намаганні ЦК КПБ забяспечыць актыўны ўдзел юнакоў і дзяўчат у будаўніцтве і ўмацаванні дзяржаўнасці Беларусі, як агульнасавецкай, так нацыянальнай, давалі свой вынік. Выказванне патрыятычных настрояў моладдзю праз актыўны ўдзел ва ўсесаюзных добраахвотных будаўнічых атрадах так сама садзенічала дзяржаватвочым працэсам. Моладзь Беларусі з вялікім інтузіязмам брала ўдзел у будоўлях на Радзіме, якіх налічвалася каля 19 (Лукомльская ГРЭС, Мозырскі нафтаперапрацовачны завод, Белшына, Салігорскі калійны камбінат і інш). Маладыя людзі забяспечвалі эканамічны рост сваёй краіны, працуючы і ў сельскай гаспадарке і на розных сацыяльназначных аб’ектах.

Яшчэ адным фактарам, які ўплываў на функцыянаванне дзяржаўнага механізму і быў спецыфічным для кожнай рэспублікі, з’яўляўся нацыянальны склад насельніцтва. Статыстычныя дадзеныя за 1959 г. дэманструюць наступную карціну: 81,1 % беларусаў, 8,2 % рускія, 6,7 % палякі, 1,7 % украінцы, 1,9 % яўрэі, 0,4 % іншыя нацыянальнасці [1, с. 55]. Своеасаблівая сітуацыя склалася пасля абвяшчэнння Партыяй у пачатку 60-х курса на паступовае зліццё нацый для больш шчыльнага яднання савецкай дзяржавы і хутчэйшага будаўніцтва камунізма. На думку калектыва аўтараў выдання Інстытута гісторыі НАН Беларусі па гісторыі беларускай дзяржаўнасці, назіралася прамая залежнасць роста нацыянальнай самасвядомасці ад працэсаў невіліроўкі нацыянальных рыс [1, с. 80]. Але трэба ўлічваць той факт, што гэтая тэндэнцыя назіралася сярод невялікай групы інтэлегенцыі, асноўная ж маса рабочых і сялян разважала катэгорыямі трансліруюмымі партыйным кіраўніцтвам аб “далейшай уніфікацыі” і “выхаванні пачуцця савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, настойліва весці барацьбу супраць драбнейшых праяў месцячковасці …” [1, с. 70]. Як бачна, пытанне аб нацыянальным складзе і ўплыве гэтага сацыяльна-дэмаграфічнага

паказчыка на дзяржаўныя працэсы адно з самых цікавых і па сёняшні дзень мала даследаваных.

Падсумоўваючы вышэй прыведзены матэрыял, можна зрабіць выснову аб тым, што грамадства Беларускай ССР у сярэдзіне 50-х – сярэдзіне 60 –х гг. ХХ ст., з’яўляючыся часткай вялікага агульнасавецкага соцыўма, было ўключана ў працэсы дэмакратызацыі ўсіх сфер жыцця, далучэння да палітычна партыйнай дзейнасці, павелічэння колькасці занятых у вытворчасці, папулярызацыю руха будатрадаў і інш. Аднак, неабходна адзначыць, што грамадства нашай краіны мела дэмаграфічныя асаблівасці. Сярод іх: запаволеныя тэмпы роста гарадскога насельніцтва і рабочага класа, пры відавочным ускладнёным жыцці ў вёсцы. Урбанізацыя насельніцтва паступова ішла, але цесныя сувязі з вёскай захоўваліся. Камуністы беларускага паходжання былі слаба прадстаўлены ў кіраўніцтве партыйных арганізацый і на прадпрыемствах рэспублікі. Пасады кіраўнікоў, як правіла, займалі прыезжыя камуністы іншых нацыянальнасцей. Дабраахвотныя працоўныя атрады камсамольцаў БССР былі задзейнічаны на мясцовых будоўлях (шмат якія з іх мелі саюзнае значэнне) і ў сельскагаспадарчай сферы. Назіраліся пэўныя супярэчнасці сацыяльна-дэмаграфічная развіцця на землях далучанай у 1939 г. да БССР Заходняй Беларусі.

Неаспрэчнай з’яўляецца выснова, што соцыўм гэта суб’ект гістарычнай творчасці. На дзяржавабудаўнічыя працэсы моцна ўплавалі і уплаваюць такія дэмапаказчыкі як прафесійная прыналежнасць, пабытовыя, жыллёвыя ўмовы, узровень захворвання і сярэдняй працягласці жыцця; паказчыкі шлюбнасці, нараджальнасці і смяротнасці. Разнастайнае і зменлівае асяроддзе падштурхала партыйнае кіраўніцтва да прыняцця адпаведных рашэнняў у сферы гаспадаркі, будаўніцтва, транспарту, сістэмы аховы здароўя, адукацыі, культуры і інш. Партыя, ў сваю чаргу, атаясамлівалася з дзяржавай і адказвала за шляхі і метады развіцця рэспублікі.

Літаратура:

1. История белорусской государственности. В 5 томах. Мн.: Беларуская навука, 2020. Т. 5 –480 с.
2. Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 частках. Мн. 1992 Ч.2 –560 с.
3. Пономарёва Е.Г. Республика Беларусь: внутренние факторы развития государсртвенности // Проблемы управления №3 2014 – С. 17-22,
4. Риер Я.Г. Историческая демография: уч пособие / Я.Г. Риер 2-ое изд. – Могилёв 2006 – 160 с.